ВЫДАННЕ АСВЕТНІКАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Настаўніцкая газета



Выхаванне — галоўная задача адукацыі

Моладзь трэба пачуць і зразумець

# Студэнцкі хор: праз традыцыі — да эксперымента

21.03.2017 10:32 Дадатковая адукацыя без каментарыяў

**На базе Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта прайшоў рэспубліканскі семінар-практыкум "Маладзёжны хор: пеўчыя традыцыі і творчы эксперымент". Удзельнікамі двухдзённага мерапрыемства, арганізаванага Нацыянальным цэнтрам мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, сталі кіраўнікі калектываў харавога жанру ўстаноў вышэйшай і дадатковай адукацыі.**

— Семінар-практыкум кіраўнікоў харавых калектываў працягвае цыкл метадычных мерапрыемстваў па розных напрамках выхаваўчай работы з моладдзю ва ўстановах вышэйшай адукацыі і творчай дзейнасці студэнтаў у вольны час, — расказала загадчыца аддзела сацыякультурных праектаў навучэнскай і студэнцкай моладзі Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі А.С.Лаўрыновіч. — Гэта добрая пляцоўка для абмену педагагічным вопытам, дэманстрацыі творчых дасягненняў, абмеркавання перспектыў развіцця харавых калектываў і наладжвання прадукцыйнага ўзаемадзеяння паміж імі.



Даволі цікавым атрымаўся майстар-клас мастацкага кіраўніка студэнцкага акадэмічнага хору Melior ПалесДУ С.Л.Гарбачэўскай па выкарыстанні элементаў аўтарскіх методык у развіцці вакальна-харавых навыкаў удзельнікаў студэнцкага харавога калектыву. Шмат станоўчых эмоцый падарыла канцэртная праграма з удзелам харавых калектываў БрДТУ, ПалесДУ і Брэсцкага дзяржаўнага музычнага каледжа імя Р.Р.Шырмы.

Удзельнікі семінара-практыкуму азнаёміліся з дзейнасцю ўніверсітэцкага аддзела студэнцкіх ініцыятыў і культурна-адпачынкавай работы, які ўзначальвае І.В.Ангалюк, абмеркавалі пытанні стану і развіцця харавога жанру на Брэстчыне, традыцыйную і сучасную беларускую музыку ў рэпертуары харавых калектываў, сучасныя падыходы ў рабоце з маладзёжным хорам і інш.

Сяргей ГРЫШКЕВІЧ.
Фота аўтара.